# ВЫХОДЖУ НА ЦЭЛЬ!

Сянькоў Ціт Рыгоравіч нарадзіўся ў 1917 годзе ў сям'і селяніна вёскі Старакошаўка Горацкага раёна. Службу У Савецкай Арміі пачаў у 1937 годзе. Закончыў авіяцыйнае вучылішча. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны на фронце. Штурман самалёта, а потым эскадрыллі бамбардзіроўшчыкаў. Ваяваў на Калінінскім, Сталінградскім, Стэпанавым, Варонежскім і 2-м Украінскім франтах.

Звання Героя Савецкага Саюза ўдастоен Указам Прэзідыума Вярхоунага Савета СССР ад 26 кастрычніка 1944 года. Пасля вайны працягваў службу ў ВПС. Цяпер жыве ў Адэсе.

Недзе над правым берагам Дняпра ўзвышаецца невялікі пасёлак Даматкань. Там восенню 1943 года быў наш плацдарм.

...Трэці дзень насмерць стаіць там пяхота. Трэці дзень супраць яе фашысты кідаюць артылерыю і танкі, авіяцыю і мінамёты. Вось-вось вораг захопіць пераправу і тады... Наогул становішча крытычнае. Вось калі б авіяцыя... Але, як на грэх, зарадзілі асеннія дажджы. Неба – нібы непранікальная вадзяная сетка. Аэрадромы размыла так, што ні ўзляцець, ні сесці. Але дапусцім, авіяцыя пагрэбавала ўсімі перашкодамі, дабралася да гэтай Даматкані, паспрабуй з паветра разабрацца: дзе свае, дзе чужыя... З цяжкім сэрцам выслухалі паведамленне камандзіра палка афіцэры, якія сабраліся на КП. У думках усіх паўстала жменька змучаных трохдзённым змаганнем нашых байцоў, якія з надзеяй і дакорам пазіраюць у неба, а сокалы ў зямлянках вымушаны знаходзіцца.

– Дазвольце, таварыш гвардыі палкоўнік! – гэта папрасіў слова штурман эскадрыллі гвардыі капітан Ціт Сянькоў.

– Наша эскадрылля можа вылецець на Даматкань!

– Добра, рыхтуйцеся да вылету!

І вось ужо вырульвае з укрыццяў дзевятка "петляковых". Цяжка ім на вязкім полі. Усе, хто стаяў на аэрадроме, уздыхнулі з палёгкай, бачачы, што, нарэшце, бамбардзіроўшчык далёка на гарызонце, ледзь не закрануўшы дуброву, адарваўся ад зямлі.

Штурман вёў эскадрыллю дакладна па курсу. Вёў па толькі яму вядомых арыенцірах. Таму што ні на небе, ні на зямлі нічога не было бачна. Але ўсе пілоты, усе штурманы ведалі, што Сянькоў дакладна выведзе да цэлі, што ён не памыліцца. Чуццё ў Ціта Рыгоравіча такое. І яшчэ праславіўся ён сярод авіятараў як снайпер бомбамятання.

Маладых штурманаў палка вучылі на прыкладзе харкаўскай аперацыі Сянькова. Было гэта 5 жніўня 1943 года. Разведчыкі ўстанавілі вялікае скапленне варожых сіл на ўскраіне горада. Туды павёў сваю дзевятку штурман Сянькоў. 53 аўтамашыны з войскам, 10 вагонаў, мінамётная батарэя былі тады знішчаны ў выніку магутнага бомбавага

ўдару, а нашы наземныя часці атрымалі магчымасць узмацніць штурм Харкава.

...Вось ён, нарэшце, плацдарм! Угадваўся ён па чырванаватых успышках снарадаў. А больш нічога не бачна! Бамбіць небяспечна, якраз можна трапіць у сваіх... Што і казаць, прыйшлі на дапамогу! А такое бывала ў гэтай вялікай вайне. Раптам па самалётах адкрылі зенітны агонь. Сянькоў нават абрадаваўся гэтаму. Ён ведаў, што страляюць не нашы з плацдарма, яны папярэджаны, а немцы. Трэба накіравацца туды, адкуль вядзецца загараджальны агонь. Услед за вядучым уся дзевятка перайшла ў піке. Адначасова штурманы націснулі на бомбаскідальнікі... Імгненне – і спапяляючы агонь азарыў зямлю. Гарэлі танкі, мінамёты, у паветра ўзляталі машыны з боепрыпасамі... Фашысты ў паніцы ўцякалі далей ад гэтага пекла.

123 разы за гады вайны па рацыі чуў фронт паведамленне штурмана Ціта Рыгоравіча Сянькова:

– Выходжу на цэль.

Подзвіг, памножаны ў 123 разы.

**Выходжу на цэль! // Магілёўская праўда. — 1970. — 4 ліпеня. — С. 4.**